# СА СВЯТАМ КАСТРЫЧНІКА!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (888) ● Чацвер, 5 лістапада 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ, ВЯРШЫНЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! БУДЗЬЦЕ ВЕРНЫМІ ЛЕНІНСКІМ ЗАПАВЕТАМ, АКТЫЎНЫМІ БУДАЎНІКАМІ КАМУНІЗМА!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 53-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).*



## УНІВЕРСІТЭТ ПЕРАДСВЯТОЧНЫ

МІНУЛА ужо больш паувека, а гэтае свята па-ранейшаму узрушвае сэрцы савецкіх людзей. У адных Кастрычнік абуджае успаміны рэвалюцыйных баёу, у другіх — бурлівых гадоу сацыялістычнага будауніцтва і самаадданай барацьбы з ворагамі Савецкай дзяржавы.

Моладзь святкуе Кастрычнік як заваёву дзядоу, здабытак папярэдніх пакаленняу, падараваушых сённяшняму шчасце мірнага, забяспечанага жыцця, якое напоўнена працай, пошукамі, здзяйсненнямі.

Возьмем для прыкладу адзін толькі універсітэцкі перадсвяточны дзень. Чым жыве калектыу, што радуе яго і хвалюе? Як звычайна, сваім ходам ідуць на усіх факультэтах лекцыі, семінарскія і практычныя заняткі. Чарговае пасяджэнне вучонага савета разглядае дысертацыйныя работы па фізіка-матэматычных навуках.

Навуковая грамадскасць зацікаулена сачыла за ходам першай рэспубліканскай канферэнцыі лаурэатау конкурсу студэнцкіх навуковых работ вну БССР. На дзвюх яе секцыях — фізіка - матэматычных, біялагічных і сельскагаспадарчых навук — было заслухана каля 200 дакладау, у тым ліку больш 20 універсітэцкіх. Пяць дакладау нашых студэнтау прызнаны лепшымі. Іх аутары Ленінскі стыпендыят А. Верашчагін (хімфак), Б. Каліцін (матфак), А. Ягорау (фізфак) і іншыя атрымалі прэміі.

У дэканатах і камітэце камсамола распрацоуваюць святочныя мерапрыемствы, удакладняюць дзень, час, месца вечароу. Палітінфармацыі і сустрэчы прысвячаюцца гераічнай гісторыі нашага народа, знаёмству з ветэранамі рэвалюцыі, ушанаванню яе барацьбітоу.

Факультэцкія агітбрыгады рыхтуюцца да канцэртау, выездау у падшэфныя раёны.

Давайце зойдзем у камітэт камсамола хімічнага факультэта. Тут якраз сабраліся удзельнікі адной з агітбрыгад. Іх слухачамі будуць працаўнікі калгаса імя У. І. Леніна Staубцоускага раёна.

Хлопцы устанаулівають апаратуру, ціхенька наігрывае на гітары Саша Шурынау, дзяучаты з вакальнай групы абмяркоуваюць свае песні. Але вось да мікрафона падыходзяць Слава Дземчанка і Аляксей Паулау. Першыя акорды. У пакоі усталёуваецца цішыня, і толькі песня адчувае сябе гаспадыняй.

У суседняй аудыторыі танцоры рэпеціруюць венгерскі танец. Некалькі разоу пачынаюць спачатку удзельнікі сцэнкі «Карэспандэнт». Паступова уваходзіць у ролю канферансье Ігар Гарэцкі. Заклапочаны выгляд у кірауніка Сяргея Ігнаценкі... Ідзе звычайная рэпетыцыя, з творчымі спрэчкамі, хвалявання мі і радасцямі.

А цяпер заглянем да матэматыкау. І тут перадсвяточныя клопаты: выпуск насценгазеты, візіты да сяброу.

Матэматычны факультэт — дауні сябра школы № 45 Мінска. Студэнты дапамагаюць школьнікам праводзіць вечары, часта чытаюць лекцыі і даклады, выступаюць з канцэртамі. Не аднойчы на практычных занятках на факультэце можна было бачыць гасцей — вучняу гэтай школы, юных аматарау матэматыкі.

А сённяшнія госці старшакласнікау — студэнты IV курса Наташа Дзянісава і Барыс Лейзаронак. Яны рас-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## ВЯЛІКІ ПОСПЕХ

Яшчэ свежыя у памяці тыя дні, калі ва універсітэце праходзіу першы этап Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Тады у ім прыняло удзел больш 1.500 студэнтау універсітэта. На Усесаюзны конкурс рэспубліканскае журы рэкамендавала 40 работ студэнтау БДУ.

І вось цяпер сталі вядомы вынікі заключнага, трэцяга этапу Усесаюзнага конкурсу. Яны пераузышлі усе самыя аптымістычныя чаканні. З 30 студэнтау, прадстаунікоу розных вну краіны, работы якіх атрымалі самую высокую ацэнку, 6 студэнтау з Беларусі, у тым ліку пяцёра — выхаванцы нашага універсітэта. Лаурэатамі Ўсесаюзнага конкурсу сталі Леанід Лойка, Ганна Селязнёва, Міхаіл Вінікау, Юрый Шынкар — студэнты гістарычнага факультэта і Святлана Алексіевіч — студэнтка факультэта журналістыкі. Ім уручаны медалі лаурэатау і першыя прэміі — турысцкія пуцёукі па ленінскіх месцах за мяжой. Пераможцамі конкурсу сталі яшчэ 6 студэнтау БДУ: Мікалай Руновіч, Аляксандр Байчароу, Іван Грыгарчук (усе гістфак) атрымалі другую прэмію. Яны узнагароджаны падпіскай на Поуны збор творау У. І. Леніна, а Уладзімір Дук, Людміла Пятручык і Ларыса Саглаева (таксама студэнты гістфака) заваявалі трэцюю прэмію. Вялікі поспех, які выпау на долю студэнтау універсітэта, у роунай меры належыць і іх навуковым кіраунікам: дацэнту кафедры гісторыі КПСС І. О. Царук (пад яе кірауніцтвам працавалі чатыры пераможцы Усесаюзнага конкурсу), прафесару В. І. Сцяпанаву, прафесару А. Я. Жураву, дацэнтам М. В. Рожыну, З. Г. Грыгор'евай, А. М. Паулючэнку і ст. выкладчыку І. І. Уласенка. Неабходна адзначыць, што палова пераможцау конкурсу — актыуныя удзельнікі студэнцкага навуковага гуртка пры кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтау.

Па выніках гэтага конкурсу БДУ імя У. І. Леніна адзначан як адна з лепшых вну краіны. Гэты небывалы поспех студэнтау і выкладчыкау універсітэта асабліва знамянальны цяпер, калі наш універсітэт рыхтуецца да свайго 50-годдзя.

**Дз. САКОВІЧ,**
**адказны за работу СНТ універсітэта.**

**Г. Н. Селязнёва.** «Дзейнасць Кампартыі Беларусі па развіццю народнай адукацыі ў БССР (1917—1936 гг.)».
Навуковы кіраўнік — дацэнт **І. О. Царук.**

**С. А. Алексіевіч.** «Зброяй ленінскіх ідэй (Камсамольска-маладзёжны друк Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны)».
Навуковы кіраўнік — прафесар **А. Я. Жураў.**

**М. І. Віннікаў і Ю. С. Шынкар.** «Праблема асобы ў дакастрычніцкіх творах У. І. Леніна».
Навуковы кіраўнік — прафесар **В. І. Сцяпанаў.**

**Л. В. Лойка.** «Развіццё КПСС ленінскіх ідэй аб маральным і матэрыяльным стымуляванні працы ў працэсе пабудовы сацыялізма і камунізма».
Навуковы кіраўнік — дацэнт **А. М. Паулючэнка.**





# ЗНАЁМСТВА АДБЫЛОСЯ

Гэта была адна з тых цёплых сяброўскіх сустрэч, якія запамінаюцца надоўга. Навучэнцы Маладзечанскага тэхнічнага вучылішча № 87 запрасілі на свой традыцыйны інтэрнацыянальны вечар студэнтаў-іншаземцаў нашага універсітэта.

І вось у суботу адна з агітбрыгад савета дружбы пад бурныя воплескі выхаванцаў і выкладчыкаў вучылішча падымаецца на сцэну.

Выступае в'етнамскі студэнт Нгуен В'ет Хунг. Ён расказвае аб мужнасці свайго народа.

— У нашай барацьбе мы заўсёды адчуваем дапамогу сацыялістычных краін,—гаворыць Нгуен В'ет Хунг.

У доўгіх воплесках гучаць словы падзякі савецкаму народу і нашай моладзі за вялікую дапамогу.

А залу ўжо захопліваюць словы Жака Антуана Амідзі з Лівана аб барацьбе народаў Блізкага Усходу з імперыялізмам, аб спробах унутранай рэакцыі утапіць у крыві справядлівыя патрабаванні арабскіх народаў.

— Вашу падтрымку і дапамогу мы адчуваем на кожным кроку. Народ Лівана хоча, вельмі хоча дружыць з Савецкім Саюзам.

— Я, як і мае сябры, рада бачыць, што сувязі нашых краін становяцца ўсё больш цеснымі,—гаворыць Жэні Маганьёз, прыехаўшая да нас на стажыроўку з Францыі.—І я вельмі рада, што сёння асабіста магу пажадаць вам многа поспехаў у пабудове новага грамадства, што, вярнуўшыся дамоў, змагу расказаць маім сябрам праўду аб вашай краіне.

Затым аб важных праблемах і задачах маладзёжнага руху ў Афрыцы гаворыць намеснік старшыні савета дружбы Самір Шахін з Судана:

— Сёння мы робім амаль што першыя крокі. Стагоддзі каланіяльнай залежнасці паклалі свой адбітак на жыццё краіны. І нашы задачы сёння—з'яднанне ўсёй моладзі Афрыкі ў барацьбе супраць неакаланіялізму, устанаўленне цесных сувязей з маладзёжнымі арганізацыямі сацыялістычных краін і перш за ўсё з камсамолам, пераймаць вопыт якога мы заклікаем усю моладзь Афрыкі. Нас радуе, што сёння моладзь Афрыкі ўсё больш імкнецца да супрацоўніцтва з маладымі камуністычнымі партыямі, з'яўляецца адным з найбольш паслядоўных іх саюзнікаў.

Гераізму моладзі Кубы ў барацьбе і працы прысвяціў свой расказ студэнт БПІ Рыкердо Барталемео, аб барацьбе за дэмакратыю ў Афганістане гаварыў наш студэнт Гафур Султані, аб моладзі Румыніі—аспірант Страт Мітакі.

А з якім захапленнем былі сустрэты в'етнамскія і ўкраінская песня «Ручнікі» ў выкананні Хо Нгок Чонга, рэвалюцыйная песня французскіх рабочых у выкананні Жэні Маганьёз і Жака Амідзі. І таму цяжка было дачакацца ў канцы вечара Жэні, якую ніяк не хацелі адпускаць любіцелі аўтографаў.

Сустрэча глыбока пераканала: сяброўства моладзі розных нацыянальнасцей выхоўвае сапраўдных інтэрнацыяналістаў.

**В. КУШНЕР,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ.**

# УНІВЕРСІТЭТ ПЕРАДСВЯТОЧНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

казалі аб сваім факультэце, аб тым, як жывуць іх сябры, аб адкрытым у гэтым годзе факультэце прыкладной матэматыкі.

Вядома, немагчыма расказаць аб усіх цікавых навінах і падзеях, што адбываюцца ў шматтысячным універсітэцкім калектыве, але аб гэтай радаснай вестцы прыемна паведаміць якраз напярэдадні свята. Наш універсітэт заваяваў першае месца ў рэспубліканскім аглядзе-конкурсе сярод гуманітарных, педагагічных, эканамічных інстытутаў і універсітэтаў па пастаноўцы навукова-даследчай работы студэнтаў. Калектыву БДУ імя У. І. Леніна уручан пераходны прыз «Навука», вялікі хрустальны кубак і Ганаровая грамата Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, ЦК ЛКСМБ, Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза і Беларускага рэспубліканскага савета навукова-тэхнічных таварыстваў. Гэта вялікі поспех студэнтаў, выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, усіх тых, хто прымае актыўны ўдзел у развіцці студэнцкай навуковай творчасці ў БДУ. Гэта ўзнагарода — дастойны падарунак святу.

**Г. НАУМЧЫК,**
**Л. ПЕРАСЫПКІНА,**
**І. СЦЯПУРА,**
студэнты.





* * *

Ціха ў калідорах біялагічнага факультэта ў гэтыя перадсвяточныя дні. На ўсіх курсах, ад першага да пятага, ва ўсіх лабараторыях ідзе свая будзённая работа. У адзін з такіх дзён і былі зроблены гэтыя здымкі...

Лабараторыя біяхіміі. За вопытам адрэналэктаміі жывёлы—студэнты-выдатнікі чацвёртага курса. Як будзе весці сябе звычайная мыш пасля пазбаўлення яе ад надпочачнікаў? Як падзейнічае гэта на жыццёвыя функцыі? Засяроджана праводзяць вопыт **Г. Васілеўская, О. Бялецкая, Л. Грыцай** і **В. Бяляўскі.**

Вялікі спецпрактыкум студэнтаў чацвёртага курса працягваецца і ў лабараторыі кафедры беспазваночных. Тут яны рыхтуюць для першакурснікаў прэпараты гідры. **На здымку: Т. Гарбачова** і **Л. Герасімава** заканчваюць работу.

**В. ЖУК,**
**наш. кар.**

# ЭКЗАМЕН НА ДРУЖБУ

**Для нас, першакурснікаў факультэта журналістыкі, сёлетні год запомніцца надоўга: мы сталі студэнтамі універсітэта. Да гэтага ў кожнага з нас былі розныя шляхі-дарогі. Многія юнакі і дзяўчаты прыйшлі прама са школы, іншыя — з заводаў, фабрык, маючы ўжо працоўны стаж. Цяпер нас яднае адна мэта— стаць журналістамі.**

**Першым нашым экзаменам на дружбу, калектывізм была дапамога калгасам і саўгасам нашай рэспублікі ва ўборцы бульбы. Працаваць нам давялося ў Дзяржынскім раёне, у калгасе імя М. Горкага. Раздзялілі нас на пяць груп і паслалі па брыгадах. Праўда, такое размеркаванне не радавала: хацелася быць усім разам.**

**Праца ў калгасе нас яшчэ больш зблізіла. Дзяўчаты і хлопцы з песняй выходзілі на работу, разам адпачывалі, ставілі канцэрты ў сельскіх клубах. Адразу ж прайшлі камсамольскія сходы па групах: выбралі сваіх важакоў, абмеркавалі, як будзем праводзіць вольны час. Пачалі дапамагаць школе, ажывілі маўклівыя клубы.**

**У працы мы ўбачылі кожнага такім, які ён ёсць. Вельмі прыемна, што на курсе не аказалася «мамчыных сыночкаў», хлюпікаў. Усе студэнты працавалі вельмі добра. Аб гэтым гавораць тыя падзякі і граматы, якія мы прывезлі з калгаса. Як-ніяк мы выбралі каля 600 тон бульбы, дапамаглі пабудаваць кароўнік.**

**Адным словам, цудоўныя хлопцы і дзяўчаты на нашым курсе, дружныя, вясёлыя, у цяжкую хвіліну заўсёды прыйдуць на дапамогу. І мне здаецца, што гэты калектыў пранясе сваю дружбу праз усе гады вучобы ва універсітэце.**

**Н. АКСЯНЕВІЧ,**
**староста І курса журфака.**

# СВЯТКУЕМ РАЗАМ З ВАМІ

У ГЭТЫМ годзе, адзначаючы ленінскі юбілей, усе працоўныя Савецкай краіны выйшлі на працоўны суботнік. Сярод іх былі і іншаземцы. Дэканат па навучанню замежных грамадзян універсітэта прывітаў наша пажаданне прыняць удзел у суботніку. І вось настаў дзень, калі мы занялі сваё месца сярод жыхароў горада Мінска. Працавалі з вялікім натхненнем. Гэта быў наш падарунак да дня нараджэння правадыра ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва.

Суботнік стаў пачаткам працоўных спраў студэнтаў- іншаземцаў. Многія з нас прынялі ўдзел і ў працоўным семестры. Лета—пара адпачынку. Але яшчэ лепш, калі гэты адпачынак спалучаецца з карыснай работай. 16 замежных студэнтаў працавалі на будоўлях Беларусі, каля 100 — на трактарным заводзе.

Нас уразіла вялікая арганізаванасць рабочых, клопаты партыйнай і прафсаюзнай арганізацый, дзейнасць камсамольскай арганізацыі сярод маладых рабочых.

Мы прынялі актыўны ўдзел і ў грамадскім жыцці прадпрыемстваў, на якіх працавалі: слухалі лекцыі і гутаркі, прысутнічалі на рабочых сходах. Разам з калектывам праводзілі выхадныя дні, адпачываючы за горадам, у лесе. Такія сумесныя паездкі дапамаглі лепш зразумець і пазнаць адзін другога.

Многае з таго, што мы ўбачылі на фабрыках і заводах, дзе працавалі, знаходзіць сваё юрыдычнае замацаванне ў Асноўным законе — Канстытуцыі СССР, якая дае права ўсім грамадзянам на адпачынак, працу, бясплатную вучобу. Рабочы ў краіне, народжанай Вялікім Кастрычнікам, з'яўляецца паўнапраўным гаспадаром, будаўніком светлага заўтра —камунізма.

Напярэдадні 53-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і XXIV з'езда КПСС нам, іншаземцам, хочацца сказаць, што наша задача заключаецца не толькі ў тым, каб атрымаць грунтоўныя веды, стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, але і ў тым, каб прымаць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта, усёй краіны.

Ад імя савета дружбы універсітэта я віншую ўсіх савецкіх людзей з вялікім святам —днём нараджэння першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы і жадаю далейшых поспехаў у будаўніцтве камунізма.

**Самір ШАХІН (Судан), студэнт юрыдычнага факультэта, намеснік старшыні савета дружбы БДУ.**

# МАСТАК-ЖУРНАЛІСТ

Факультэт журналістыкі сёлета навасёл: пераехаў з вул. Чырвонаармейскай у больш прасторнае памяшканне юрыдычнага корпуса. Абжыцца на новым месцы аказалася не так ужо проста: акрамя ўстаноўкі рознага абсталявання, трэба было і аформіць усё належным чынам. Але зайдзіце цяпер на факультэт і вы пераканаецеся, што гэтая задача паспяхова выканана. Усюды бачна праца выкладчыкаў і студэнтаў: з густам аформленыя тэматычныя стэнды, выстаўкі, маляўнічыя плакаты. У кожным з іх важкая часцінка працы мастака-афармляльніка, дакладней кажучы, цяпер ужо студэнта-першакурсніка Мікалая Дыма.

Перамена асноўнай спецыяльнасці—не выпадковая змена ў жыцці юнака. Нямала прафесій перамяніў ён, але ў душы заўсёды заставаўся журналістам: у арміі быў спецкорам «дывізіёнкі», на «грамадзянцы» яго прозвішча часта можна было заўважыць на старонках маладзёжных выданняў. Вось і ў гэтым годзе некаторыя раілі паступаць у мастацкі інстытут. Можа б і атрымаўся з яго мастак, але творчае спалучэнне дзвюх спецыяльнасцей таксама можа даць вялікі плён.

**Ф. ПРАТАСЕНЯ**, студэнт.



*НА ЗДЫМКУ: практычныя заняткі па арганічнай хіміі у студэнтау трэцяга курса хімічнага факультэта. Ля прыбора Генадзь СЕМЯЧКА і Леанід СІДАРЦОЎ.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

# «ЗВІНІ, ЗВІНІ, ЗАЛАТАЯ РУСЬ!»

Актавая зала філалагічнага факультэта перапоунена. На відным месцы — кніжная выстаука «Да 75-годдзя з дня нараджэння Сяргея Ясеніна». Студэнты, выкладчыкі, супрацоунікі бібліятэкі, якія рыхтавалі гэты вечар разам з кафедрай рускай савецкай літаратуры, сабраліся, каб аддаць даніну любві і павагі вялікаму рускаму паэту.

Дацэнт С. А. Лысенка гаворыць кароткае уступнае слова, а потым прафесар Л. І. Фіглоуская расказвае аб жыццёвым і творчым шляху Сяргея Ясеніна, аб яго вялікім паэтычным таленце.

Гучаць у зале цудоуныя ясенінскія вершы, урыукі з паэм. Чытаюць студэнты філфака Шымановіч і Патапава. А пасля захоплівае аудыторыю запрошаны на вечар артыст Беларускага дзяржаунага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы М. Р. Казінін. І зачараваныя слухачы прыпадаюць да празрыстай крыніцы ясенінскай паэзіі — «Разметался пожар голубой», «Пушкину», «Дай, Джим, на счастье лапу мне», «Письмо к женщине», «Станция»... І зноу студэнты Капецава, Пятровіч, Курносенка, Далец, Паулюкавец чытаюць вершы Ясеніна.

Не абысціся у такі вечар без музыкі, і яе цудоуна прадстауляе народны аркестр народных інструментау пад кіраунііцтвам М. А. Лісіцына.

А у заключэнне прысутныя з цікавасцю прагледзелі дакументальны фільм, які дапамог яшчэ больш яскрава уявіць воблік паэта.

**М. ВЯРГЕЙЧЫК,**
студэнт.

# «СІБІРСКІЯ АГНІ»

На днях на універсітэцкай сцэне выступіу эстрадны калектыу г. Новасібірска. Артысты выконвалі не толькі сучасныя эстрадныя песні, але і сібірскія народныя.

З цікавасцю слухалі студэнты «Баладу аб цыганцы» у выкананні Лідзіі Кароль, а таксама задорныя сібірскія прыпеукі спявачкі Любові Суханавай. Цёпла былі сустрэты малады спявак Генадзь Пісарау і дыпламант Усерасійскага конкурсу Уладзімір Пахмутау.

Асабліва спадабалася усім выступленне артыста арыгінальнага жанру Міхаіла Майсеева і вясёлыя жарты канферансье Святланы Паулавай і Паула Святлова.

Добрыя і шчырыя усмешкі на тварах гледачоу сведчылі аб удзячнасці гасцям за разнастайную і цікавую праграму.

**М. МАЦЕЙКА.**

## У ДАПАМОГУ ЛЕКТАРУ І ПРАПАГАНДЫСТУ

# Ф. ЭНГЕЛЬС І РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ БЕЛАРУСЬ

*(Заканчэнне. Пачатак у № 30).*

КІРУЮЧЫ Інтэрнацыяналам, аб'ядноуваючы пралетарыяу розных краін, К. Маркс і Ф. Энгельс апіраліся на вялікую дапамогу Антона Трусава (1835—1886). Ураджэнец горада Барысава, ён гімназістам стау на шлях рэвалюцыйнай барацьбы. Гэта было у Мінску. Потым у Маскве, ва універсітэце, ён прайшоу школу студэнцкіх падпольных гурткоу, зблізіуся з арганізацыяй «Зямля і воля» і на пачатку паустання 1863 года у Польшчы, Літве і Беларусі ужо быу ідэалагічна падрыхтаван да ролі кірауніка рэвалюцыйных мас у іх бітве з самауладствам. На радзіме ён далучыуся да левага крыла рэвалюцыянерау, што рыхтавалі паустанне, якім кіравау Кастусь Каліноускі.

Некалькі год таму назад беларускі даследчык Г. Кісялёу выявіу у архівах Масквы, Мінска, Вільнюса і іншых гарадоу многа звестак аб актыуным удзеле Антона Трусава у паустанні 1863 года на Беларусі. Ён быу адным з кіраунікоу паустання у Мінскай губерні і да канца 1863 года заставауся на баявым пасту.

З 1864 года А. Трусау у эміграцыі. Жывучы у Парыжы, беларускі рэвалюцыянер упершыню падрабязна знаёміцца з працамі К. Маркса і Ф. Энгельса, зближаецца з французскімі сацыялістамі, многія з якіх сталі потым кіраунікамі секцый І Інтэрнацыянала, удзельнікамі Парыжскай Камуны. Аутарытэт яго у эмігранцкіх колах быу вялікі. Праз пэуны час Уцін выклікау яго у Жэневу кіраваць друкарняй і выдавецтвам «Народное дело».

У 1870 годзе група грамадскіх дзеячоу, аб'яднаных вакол часопіса «Народное дело», сакратаром рэдакцыі якога быу Антон Трусау, стварыла Рускую секцыю І Інтэрнацыянала. 12 сакавіка 1870 года А. Трусау паслау у Лондан К. Марксу ліст, у якім падрабязна выклау праграму секцыі, пісау пра згоду з прынцыпамі Інтэрнацыянала і прасіу К. Маркса быць прадстауніком Рускай секцыі у Генеральным Савеце. К. Маркс з радасцю прыняу гэту прапанову.

Сакратар Рускай секцыі А. Трусау увесь час рабіу сур'ёзныя паслугі кіраунікам Інтэрнацыянала — у арганізацыі міжнароднай салідарнасці з Парыжскай Камунай, у барацьбе супраць анархісцкіх і іншых апартуністычных плыняу у рабочым руху. Застаючыся яшчэ у некаторых пытаннях народнікам, ён, тым не менш, быу заузяты і актыуны прапагандыст прац К. Маркса і Ф. Энгельса у Расіі і «раманскіх» краінах. Незадоуга перад ад'ездам на радзіму беларускі рэвалюцыянер выступіу супраць публікацыі часопісам «Общее дело» артыкула з паклёпніцкімі нападкамі на марксізм і на Карла Маркса асабіста. «Прачытайце Камуністычны Маніфест, статуты Інтэрнацыянала, Маніфест з прычыны франка-прускай вайны, Маніфест з прычыны Камуны, — пісау ён рэдактару часопіса, — і Вам даволі будзе пераканацца у супрацьлеглым поглядзе...»

Ф. Энгельс і К. Маркс высока цанілі подзвіг у Парыжскай Камуне і дзейнасць у Інтэрнацыянале Ганны Васільеуны Корвін-Крукоускай —сястры Соф'і Кавалеускай. Разам з Трусавым, Уціным і іншымі рэвалюцыянерамі яна пры падтрымцы К. Маркса і Ф. Энгельса шмат энергіі аддала, каб стварыць умовы узнікненню першых марксісцкіх рабочых гурткоу у Расіі.

Правадыры Інтэрнацыянала высока цанілі дзейнасць беларускіх рэвалюцыянерау у барацьбе супраць Мікалая Бакуніна і анархізму наогул. Беларускі народ ганарыцца, што яго сыны і дочкі у самыя цяжкія дні Інтэрнацыянала многа памагалі К. Марксу і Ф. Энгельсу.

Сустрэчы з Фрыдрыхам Энгельсам пакінулі незабыуны след у жыцці беларускага рэвалюцыянера Мікалая Судзілоускага (1850—1930). Уцякаючы ад праследаванняу царызму за удзел у руху народнікау, ён у канцы 1874 года эміграваy у Лондан. Тут у студзені 1875 года на сходзе, наладжаным арганізацыяй «Люд польскі» у гонар 12-й гадавіны паустання 1863 года у Польшчы, Літве і Беларусі, М. Судзілоускі пазнаёміуся з К. Марксам і Ф. Энгельсам, працы якіх, у тым ліку і «Капітал», чытау раней. Ён выступіу са шчырай прамовай, выказваючы сімпатыі да гераічных змагароу за свабоду і нацыянальную незалежнасць.

Беларускія рэвалюцыянеры і грамадскія дзеячы — выхадцы з Беларусі (мы павінны рабіць такое размежаванне, бо не усе яны былі беларусамі) — нярэдка прасілі Ф. Энгельса памагчы у выданні іх доследау, зрабіць папраукі альбо выказаць свае заувагі пра выдадзеныя працы. Так, напрыклад, рабілі П. Лауроу, В. Урублеускі і іншыя. І тут было жаданне не толькі прапусціць свае думкі праз «цэнзуру» аднаго са стваральнікау марксізма, але і параіцца з Марксам і Энгельсам, якія добра ведалі становішча у Расіі, у асобных яе правінцыях і губернях, у тым ліку і у Беларусі. Магчыма нават, што Ф. Энгельс чытау у лаурысцкім «Вперед» артыкулы беларускага рэвалюцыянера М. Судзілоускага, насычаныя шматлікімі фактамі аб народніцкім руху 70-х гадоу.

Захавалася перапіска аднаго з першых марксістау Беларусі І. А. Гурвіча з Ф. Энгельсам.

І. А. Гурвіч — мінчанін. Яшчэ студэнтам Пецярбургскага універсітэта ён актыуна уключыуся у народніцкі рух і стау чорнапераздзельцам. У 1879 годзе яго арыштавалі па справе тайнай друкарні і выслалі пад нагляд паліцыі у Мінск. Тут за працяг рэвалюцыйнай дзейнасці апальны студэнт зноу быу арыштаван і у 1881 годзе выслан на чатыры гады у Сібір. У ссылцы І. Гурвіч, кіруючыся працамі К. Маркса і Ф. Энгельса, правёу першае мясцовае даследаванне перасялення сялян, вынікам якога была кніга «Перасяленні сялян у Сібір»... У. І. Ленін назвау яе «выдатным доследам», у якім упершыню у рускай літаратуры на багатым фактычным матэрыяле прасочвалася сувязь перасяленняу з расслаеннем сялянства, з развіццём капіталістычных адносін у вёсцы.

У 1889 годзе, хаваючыся ад царскіх шпікау, І. Гурвіч эміграваy за мяжу і на пачатку 1890 года спыніуся у Чыкага. Тут ён закончыу юрыдычную адукацыю, абараніу доктарскую дысертацыю па праблемах статыстыкі і заняу прафесарскую кафедру. Аднак хутка за рэвалюцыйныя перакананні яго пазбавілі права выкладаць у вышэйшых навучальных установах ЗША. Праследаванні амерыканскіх улад, матэрыяльныя цяжкасці не зламалі рэвалюцыянера. У 90-х гадах І. Гурвіч робіцца адным з заснавальнікау сацыял-дэмакратычнай партыі ЗША, актыуна удзельнічае у прафсаюзным руху гэтай краіны. Прымыкаючы да левага крыла, ён вёу барацьбу з правым лідэрам прафсаюзау Гомперсам. Гэтая барацьба прыцягнула увагу К. Маркса і Ф. Энгельса.

У 1892 годзе у Нью-Йорку выйшла другая асноуная праца рэвалюцыянера з Беларусі «The Economics of the Russian Village» (рускі пераклад пад назвай «Экономическое положение русской деревни» з'явіуся у Маскве праз чатыры гады). Гэтая праца, як і першая, была высока ацэнена У. І. Леніным, неаднаразова выкарыстоувалася ім у барацьбе з рознымі антымарксісцкімі плынямі у Расіі.

Вось яе І. Гурвіч і адважыуся паслаць на суд Фрыдрыху Энгельсу. «Ваша міласць! — пісау ён 26 сакавіка 1893 года у Лондан. — Некалькі тыдняу назад я паслау Вам па пошце экземпляр маёй манаграфіі «Эканамічнае становішча рускай вёскі». Калі Вы выбераце час, каб прагледзець яе, то пераканаецеся, што выказаныя там погляды цалкам супадаюць з Вашымі поглядамі на гэты прадмет».

Да ліста быу прыкладзен артыкул «Сялянскае пытанне у паліцэйскай дзяржаве» — праца «аб балючых пытаннях рускага рэвалюцыйнага руху». Аддаючы яе на суд Ф. Энгельсу, аутар дадавау: «Усе мы зараз намацваем наш шлях упоцемку, і крытыка кампетэнтнага назіральніка, які знаходзіцца па-за нашымі плынямі, была б высока ацэнена усімі зацікауленымі бакамі».

Ф. Энгельс горача адгукнууся на просьбу нашага земляка і у адказе ад 27 мая 1893 года пісау: «Вельмі удзячны за Ваша цікавае даследаванне аб эканоміцы рускай вёскі, якое я прачытау, спадзяюся, не без карысці». Адзначым, што гэтую працу высока ацаніу У. І. Ленін...

У 1921 годзе, пасля адкрыцця у Мінску Беларускага дзяржаунага універсітэта, І. Гурвіч прыслау на яго адрас некалькі тысяч тамоу кніг, у тым ліку і творы Ф. Энгельса на англійскай і рускай мовах.

Пачатак выданню прац Ф. Энгельса у Беларусі («Маніфест Камуністычнай партыі», «Сялянскае пытанне у Францыі і Германіі»), зроблены у 1905 годзе мінскай групаю РСДРП, атрымау свае небывалае развіццё і сапрауды шырокі размах толькі пасля Вялікага Кастрычніка. Ужо у 1921 годзе, з утварэннем Беларускага дзяржаунага універсітэта, яны сталі прадметам навуковага даследавання. Шмат сіл вывучэнню і прапагандзе прац Ф. Энгельса аддалі члены Таварыства гісторыкау-марксістау Беларусі, пераутворанага у 1928 годзе у Таварыства марксістау БССР. У яго рабоце актыуна удзельнічалі Кнорын, Гельтман, Вальфсон, Быхоускі, Міцкевіч, Капсукас і іншыя.

Працы Ф. Энгельса спрыялі нараджэнню такіх першых даследаванняу беларускіх савецкіх філосафау, як «Дыялектычны матэрыялізм», «Дыялектычны матэрыялізм і медыцына» С. Вальфсона, «Марксізм і філасофія», «Нарыс філасофіі дыялектычнага матэрыялізму» Б. Быхоускага, «Вучэнне Ч. Дарвіна і класавая барацьба вакол дарвінізму» М. Ганчарыка і інш. У 1927 годзе у Мінску выходзіць праца П. Панкевіча «Некаторыя праблемы псіхалогіі у асвятленні Маркса і Энгельса», у якой аналізуюцца ацэнкі, дадзеныя Ф. Энгельсам розным з'явам псіхічнай дзейнасці чалавека. У сваіх доследах «Сацыялогія шлюбу і сям'і», «Сям'я і шлюб у іх гістарычным развіцці» прафесар БДУ С. Вальфсон апіраuся на метадалагічныя прынцыпы вывучэння гэтай праблемы, сфармуляваныя у «Паходжанні сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы» і іншых працах Фрыдрыха Энгельса.

Да Вялікай Айчыннай вайны беларускія вучоныя на падставе прац Ф. Энгельса напісалі шэраг фундаментальных доследау, мноства артыкулау, пачалі падрабязна даследаваць тэарэтычную спадчыну Ф. Энгельса. Яны з захапленнем сустрэлі першае выданне «Дыялектыкі прыроды» у нашай краіне. Гэтай працы філосафы і прыродазнауцы прысвяцілі шмат старонак у сваіх манаграфіях, кнігах і артыкулах.

У пасляваенны перыяд вывучэнне ідэйнай спадчыны Ф. Энгельса у Беларусі набыло асабліва шырокі размах. Гэтаму спрыялі пераклады на беларускую мову і перавыданне прац Ф. Энгельса. За гады Савецкай улады у Беларусі друкаваліся сумесныя працы К. Маркса і Ф. Энгельса 23 разы, агульным тыражом 202.200 экземплярау. Асобна працы Ф. Энгельса выдаваліся 46 разоу агульным тыражом 304.000 экземплярау.

«Параюся з Энгельсам...» Гэты выраз зрабіуся звычны у вуснах вучонага-філосафа, літаратара і мовазнауцы, гісторыка і прыродазнауцы, мастака і пісьменніка, цяперашняга рабочага і калгасніка...

Сапрауды, Беларусь стала родным домам для таленавітых баявых творау Фрыдрыха Энгельса.

**І. ЛУШЧЫЦКІ,**
**доктар філасофскіх навук.**
**М. ІОСЬКА,**
**кандыдат філасофскіх навук.**

# Спорт

## ● ВЫСТУПІЛІ ПАСПЯХОВА

З 17 па 23 кастрычніка у г. Магілёве праходзіла занальнае першынство Белсавета «Буравеснік» па баскетболу у праграме спартакіяды вну БССР 1970-71 года. Сярод мужчынскіх каманд удала выступіу калектыу Белдзяржуніверсітэта. Заняушы I месца у гэтых спаборніцтвах, наша каманда атрымала права выступіць у фінале.

Трэнер каманды старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту В. Е. Шхіньян лічыць, што рабяты выступілі удала і кожны з іх унёс дастойны уклад у поспех калектыву.

## ● ДРУГОЕ МЕСЦА

*28 кастрычніка у парку імя Чэлюскінцау адбыуся крос студэнцкага ДСТ «Буравеснік», у якім удзельнічала каманда БДУ у складзе 24 чалавек. Нашы дзяучаты Г. Лазоуская, Т. Цімашкова, В. Бруцкая, Т. Куксава, В. Цагойка, Н. Глебава занялі другое месца на дыстанцыі 500 метрау.*

*На дыстанцыі 1000 метрау дружна выступілі О. Шалыгіна, Л. Козел, М. Цікановіч, Л. Зайко, Н. Аудзей і таксама занялі другое месца.*

*Сярод мужчын на дыстанцыі 3000 метрау удачна выступіу выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту В. Я. Шпігау, які паказау другі вынік. Таксама нядрэнна пераадолеу гэтую ж дыстанцыю М. Новак (V, матфак) і А. Забела (I, гістфак).*

*У агульным заліку каманда заняла другое месца, прапусціушы наперад толькі калектыу інстытута фізічнай культуры.*

*В. ЯКАНЕН.*

# Літаратурная старонка

ШТОМЕСЯЧНЫ ВЫПУСК

## ПЕРШЫ ПРАКОС

**У сённяшняй літаратурнай старонцы выступаюць самыя маладыя узлётаўцы. Большасць — навабранцы універсітэта, студэнты першага курса Люба Тарасюк, Марыя Ціхановіч, Хведар Ляшкевіч, Васіль Сахарчук, Аляксандр Ступнікаў. Упершыню выступае і журналістка другога курса Галіна Стома.**

**Першы пракос у краіну паэзіі! Няхай ён яшчэ сціплы, сарамлівы, не ва усім роўны, але ўсё заўсёды пачынаецца з яго. У добры час выйшлі з ім пачынаючыя паэты—у святочнасць Кастрычніцкіх дзён. У добры час! — як заўсёды у народзе, кажам і мы на пачатку іх далёкіх дарог.**

**Алег ЛОЙКА,**
**кіраўнік літаб'яднання «Узлёт»,**
**доктар філалагічных навук.**

Васіль САХАРЧУК,
студэнт I курса філфака

## КАСТРЫЧНІЦКІ САНЕТ

Нам шмат дарог ад продкаў
засталося,
Дзяды нам іх у спадчыну далі,—
Багаццем краю і красой зямлі
У нашых сэрцах шчасце налілося.

Духмянае жытнёвае калоссе,
Пах свежазаранае раллі...
Якая радасць, што і мы змаглі
Пракласці першае ў жыцці
пракоссе!..

Хай кожная хвіліна блізіць мэту,
Хай будучыня сонцам свеціць свету
І слова «Мір» плыве на усе шляхі,—

Запал жыцця—аснова нашай чэсці.
І верым мы: у космас будзем несці
Па новых рубяжах чырвоныя сцягі!..



Люба ТАРАСЮК,
студэнтка I курса філфака

### ПРЫХОДЖУ, БЫЦЦАМ БЫ Ў КАЗКУ...

*Прыходжу, быццам бы*
*у казку,*
*У ціхі, светлы дом лясны.*
*Здаецца, шэпчуць:*
*«Калі ласка...» —*
*На дол апалыя лісты.*
*Павіс блакіт, як сон*
*празрысты.*
*Бяздоння сінь усё*
*глыбей.*
*Паветрам, нібы росы,*
*чыстым*
*І дыхаць быццам бы*
*лягчэй.*
*Імкнуца у вышыню*
*прабіцца*
*Узнёслых думак, мар раі.*
*І сэрца прагне чысціні*
*Такой глыбокай,*
*як крыніцы.*

### ХАЙ КЛІЧУЦЬ ШЛЯХІ, ТРЫВОГІ...

*Хай клічуць шляхі,*
*трывогі,*
*Жыцця неспакой*
*свядомы,—*
*Не зарастуць дарогі*
*Да бацькоўскага дому!..*
*Там зоры ясней на небе,*
*І бору таемней гукі,*
*І пахнуць зямлей і*
*хлебам*
*Маці ласкавай рукі.*
*...Паснулі, вокны паснулі*
*І маладзік рагаты...*
*Не спіцца толькі*
*матулям*
*Дачок, што едуць*
*дахаты!..*

Хведар ЛЯШКЕВІЧ,
студэнт I курса філфака

### СОСНЫ

Красуні-сосны — пад аблокі
Разлапістыя шапкі крон.
І бор — паназірай, здалёку —
Стаіць, як грозны бастыён.

А зашалее сівер злосны,
Вятры снягамі наляцяць —
Вяршынямі гатовы сосны
Адна другую падтрымаць.



* * *

На сенажаць за сонцам выйшаў
І не пазнаў свой родны край:
Лугоў абрусы узорна вышыў
Рудому лету белы май.

Наўкола сіціх,
жоўтых,
белых
Іскрыцца красак карагод.
Іх мёдам пахкім ахмялелы
Іду вясёлы, без клапот.

А сэрца радасна трапеча,
І неяк мне шкада крыху
Касіць рамонкаў звонкіх веча
І адуванчыкі ў пуху.

Аляксандр СТУПНІКАЎ,
студэнт I курса журфака

### ВРЕМЯ

В зале прохлада
и сумрак,
Полный тревог и забот;
Среди авосек и сумок
Парень «Гренаду» поёт.

Тихо и как-то неловко
Замерли вдруг этажи;
И по-вокзальному
громко
Голос некрепкий дрожит.

Мир удивлен и повержен
Пылкостью чистой
души;
Время буденовку держит
И за «Гренадой»
спешит.

### ХАТЫНЬ

Я утром просыпаюсь
в страхе —
Мне третью ночь стоит
в глазах
Старик в разорванной
рубахе
С ребенком мёртвым
на руках.
Его мозолистые руки
Сжимают тело, а над
ним
Колоколов больные
звуки
И облаков тоскливый
дым.
Звон беспощадно режет
небо,
А с ним и душу —
пополам.
Земля, не отданная
хлебу,
Вдовою льнет
к колоколам.



**Марыя ЦІХАНОВІЧ,**
**студэнтка I курса філфака**

### ЗА ЦЯБЕ, РАДЗІМА

Да кулямётаў грудзямі
прыпалі,
Быццам хацелі грудзі
сагрэць.
Сонца і зоры ім «Стойце!..»
крычалі,—
Яны стаялі насмерць.
Чорны каршун, раскінуўшы
крылы,
Край дарагі хацеў абляцець.
Поле і луг ім стаяць
гаварылі,—
Яны стаялі насмерць.
Лесам аблаў здратаванае
рэха,—
О, як балюча зямлі гарэць!..
«Стойце»,—шапталі лясы ім
і рэкі,—
Яны стаялі насмерць.
За радасць, за сонца
любімай Радзімы,
Каб сёння магла я свабодна
пець,
Каб рэха лавіла шчасця
матывы,—
Яны стаялі насмерць.

* * *

Колькі дарог пад снягамі,
Пад туманамі густымі!..
Дай жа, мама, рукамі
Зняць з валасоў тваіх іней!..
Ранак спакойны заняўся.
Хмарным быць небу
ці сінім?..
Мама, твой дзень будзе
ясны,
Дай зняць з плячэй тваіх
іней!..
Кажаш, сама не ўцяміш:
Снег ці гады?..
Іх не скінуць.
З галінак гадоў, мама,
Дазволь, і здыму я —
іней!..

* * *

Пакінулі вы, моўчкі адляцелі
З лісточкам, што кружыўся
па-над домам, —
Пакінулі, і мы асірацелі,
Як гнёзды, што застылі
нерухома.
Чакаю зноў, калі вясна
зайграе,
Расплюшчыць сотні
люстраных вачэй...
Алешына пры хаце, хоць
старая,
І тая стане маладзей,
званчэй!..

Галіна СТОМА,
студэнтка II курса журфака

Мне для шчасця многа не трэба,
Я не мару раскошай жыць.
Мне б заўсёды кавалак хлеба,
Каб пароўну на ўсіх дзяліць.

А яшчэ—чуць Радзімы дыханне,
Працы дружнай паміж сяброў,
Бачыць нёманскіх хваль
калыханне,
Жаўрука над світаннем бароў.

І народу сваймў прынесці
Хоць пясчынку карысці якой,
Каб было не сорамна есці
Хлеб, узрошчаны талакой!..



* * *

Я зеляніны прагну
І звону майскіх рос.
І вытканага ранняй
З туману і бяроз.
Туды б — дзяўчом—
у поле,
У травы, у лясы—
Збіраць у свой
прыпалік
Зямныя галасы!..

*Малюнкі для нумара зроблены студэнтам II курса журфака М. ІНІНЫМ.*

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 1421. АТ 21190.